*Д. А. МАРЦІНОВІЧ*

# «ПРАГМАТЫЧНАЯ МАДЭЛЬ» ЯК АСНОВА ФУНКЦЫЯНАВАННЯ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ СССР 1920-х гг.

Разглядаецца «прагматычная мадэль» універсітэта, якая рэалізоўвалася ў Савецкай Расіі — СССР у 1920-я гг. Аналізуюцца прычыны яе распрацоўкі, асноўныя палажэнні мадэлі, абставіны, якія прывялі да адмовы ад яе.

The paper discusses the pragmatic model of the university, as implemented in Soviet Russia in the 1920s, providing an analysis of the rationale behind its development, its basic principles, and an insight into the factors that led to abandoning the model.

*Ключавыя словы*: «прагматычная мадэль», вышэйшая школа, «класічны ўніверсітэт», Джон Дзьюі.

*Keywords*: «Pragmatical model», the higher school, «classical university», John Dewey.

Амаль што тысячагадовую гісторыю ўніверсітэтаў, якая пачынаецца з заснавання адпаведнай установы ў італьянскай Балонні (1088), даследчыкі падзяляюць на тры гістарычныя перыяды (адначасова яны могуць лічыцца самастойнымі мадэлямі): 1) «дакласічны», звязаны з традыцыямі сярэднявечнага карпаратыўнага ўніверсітэта (XII—XVIII стст.); 2) «класічны», звязаны з традыцыямі «даследчага ўніверсітэта» (XIX — сярэдзіна XX ст.); 3) «посткласічны» (з сярэдзіны XX ст.), звязаны з сучасным масавым універсітэтам [1, с. 11]. У сваю чаргу, у «класічным універсітэце» вылучаюцца дзве мадэлі: «ліберальная» і «прагматычная».

Першая была часткова прадстаўлена ў адукацыйнай сістэме Расійскай імперыі. Але тагачасны палітычны лад краіны абмяжоўваў асобныя палажэнні мадэлі. Пасля прыходу да ўлады бальшавікі апынуліся перад альтэрнатывай: працягваць паступовы пераход да «ліберальнай» мадэлі або пачаць паварот да «прагматычнай», досведу рэалізацыі якой на прасторы былой Расійскай імперыі не мелася.

Спачатку новая ўлада імкнулася сумясціць уласнае разуменне вышэйшай адукацыі як масавай і ўсеагульнай з прынцыпамі «ліберальнай мадэлі» «класічнага ўніверсітэта». Такая палітыка атрымала сваё адлюс-

**Марціновіч Дзяніс Аляксандравіч** — аспірант кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

траванне ў мадэлі «свабоднага ўніверсітэта», якая паслядоўна рэалізоўвалася ў перыяд пасля Другой нарады па рэформе вышэйшай школы (1918) і да пачатку 1920-х гг. Паколькі асобныя яе рысы супярэчылі адна адной, перыяд існавання мадэлі быў кароткатэрміновы. Несумяшчальнасць паміж сабой прынцыпаў мадэлі разам з фінансавым крызісам у краіне сталі прычынай адмовы ад яе. У выніку пачаўся пошук новай ідэалагічнай асновы вышэйшай адукацыі, у якасці якой выступіла «прагматычная мадэль».

Гэтая мадэль базіравалася на канцэпцыі прагматызму, што ўзнікла як філасофскі кірунак у ЗША ў 1870-я гг. Паводле меркавання даследчыкаў, прагматызм «разглядае дзеянне, мэтазгодную дзейнасць у якасці цэнтральнага, якое вызначае ўласцівасці чалавечай сутнасці» [10, с. 10]. Развіццё прагматызму традыцыйна злучаюць з імёнамі Ч. Пірса, У. Джэймса і Дж. Дзьюі [16, с. 46]. Аднак менавіта апошняга лічаць сістэматызатарам прагматызму [10, с. 10]. Дж. Дзьюі вызначаў праўду «не як адлюстраванне аб’ектыўнай рэальнасці, а як практычную эфектыўнасць, карыснасць». Таму прадстаўнікі прагматычнай педагогікі ставілі ў цэнтр педагагічнага працэсу ў пачатковай школе дзіця. Прычым яны лічылі, што развіццё яго асобы больш істотнае, чым засваенне гатовых ведаў, атрыманых ад настаўніка [16, с. 67].

Задуманая праграма першапачаткова была разлічана на пачатковую і сярэднюю школу. Паводле Дж. Дзьюі, «правільнасць ідэй, канцэпцый, паняццяў, тэорый правяраецца вынікам дасканалай працы. Калі яны справіліся са сваім абавязкам, яны надзейныя, разумныя, дакладныя, добрыя, праўдзівыя» [16, с. 67]. Ідэі, якія ўзнікаюць пры рашэнні пэўных жыццёвых задач, з’яўляліся «прыладай», што мае каштоўнасць толькі ў тым выпадку, калі карысны індывіду [19, с. 18]. Філосаф лічыў, што «развіццё ў людзей навыкаў, неабходных для прыняцця рашэнняў у дэмакратычным грамадстве, <...> дапамагло б плённа ўдзельнічаць у абдумванні і вырашэнні грамадскіх праблем» [16, с. 67]. Паслядоўнікі Дж. Дзьюі распаўсюдзілі ідэі «прагматычнай мадэлі» на ўсю амерыканскую вышэйшую школу.

Як адзначалася, на прасторах былой Расійскай імперыі амаль не мелася досведу ў рэалізацыі «прагматычнай мадэлі». Узнікае лагічнае пытанне, што паспрыяла пераходу да яе? Можна меркаваць, што рашаючым фактарам стаў уплыў на вышэйшую адукацыю канцэпцыі «працоўнай школы». Бальшавікам была непрымальная «ліберальная мадэль» «класічнага ўніверсітэта». Мадэль «свабоднага ўніверсітэта» ў пачатку 1920-х гг. пацярпела крах. Ці не адзінай альтэрнатывай заставалася «праг-

матычная мадэль». Шэраг фактараў (увага класікаў марксізму да тэорыі «працоўнай школы» ў дачыненні да пачатковага і сярэдняга прыступкаў адукацыі, прыклады яе рэалізацыі за мяжой) падштурхнулі бальшавіцкае кіраўніцтва да спроб перайсці праз «працоўную тэорыю» да «прагматычнай мадэлі». Пераход да апошняй ажыццяўляўся ў СССР на пачатку 1920-х гг. Гаварыць аб новай мадэлі дазваляюць карэнныя разыходжанні паміж сістэмамі вышэйшай школы Савецкай Расіі папярэдняга перыяду і 1920-х гг.

Так, адбыліся змены ў сістэме кіравання вышэйшай школы. Яшчэ ў чэрвені 1919 г. у складзе народнага камісарыята асветы РСФСР была створана секцыя прафесійна-тэхнічнай адукацыі. У студзені 1920 г. яна былаператворана ў Галоўны камітэт прафесійна-тэхнічнай адукацыі (рускамоўнае скарачэнне — «Главпрофобр»). Першапачаткова на яго было ўскладзена кіраўніцтва індустрыяльна-тэхнічнымі ВНУ, тады як універсітэты і асобныя ВНУ падпарадкоўваліся аддзелу вышэйшай школы або навуковаму сектару камісарыята (адзначым, што тэхнічныя факультэты гэтых устаноў у плане навучальнай працы падпарадкоўваліся таму ж «Главпрофобру»). Дэкрэтам СНК РСФСР ад 11 лютага 1921 г. «Об народном комиссариате просвещения» структура гэтай установы была рэарганізавана. Адным з галоўным аддзяленняў стала Галоўнае ўпраўленне прафесійна-тэхнічных школ (для дзяцей з 15 гадоў) і вышэйшых навучальных устаноў [4, с. 65], якому падпарадкоўваліся ўсе ВНУ. Думаецца, аб’яднанне адлюстроўвала адзінства задач і прынцыпаў вышэйшай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

На пачатку 1920-х гг. таксама адбылося значнае скарачэнне ВНУ. Падчас функцыянавання мадэлі «свабоднага ўніверсітэта» іх колькасць не абмяжоўвалася. У выніку фінансавых цяжкасцей было вырашана перайсці на рэжым эканоміі. Кіраўнік «Главпрофобра» В. М. Якаўлева 7 кастрычніка 1922 г. заявіла на пасяджэнні калегіі наркамата асветы: «Задача состояла в приведении сети учебных заведений в соответствии с той материальной базой, которую могла доставить наша разорённая страна» [13, л. 40]. Паводле звестак кіраўніка ўкраінскага «Главпрофобра» Я. П. Ряпо, на май 1923 г. у РСФСР засталося на дзяржаўным забеспячэнні 14 універсітэтаў, а тых, якія ўтрымліваюцца на мясцовыя сродкі — 9 [17, с. 63].

З 1921 г. змяніўся прынцып камплектавання студэнтаў: ён стаў класавым. Пераважнае права на залічэнне атрымалі працоўныя, сяляне і іх дзеці, члены партыі, камсамола, прафсаюзаў, якія камандзіраваліся ў ВНУ ад партыйных і дзяржаўных органаў (напрыклад, гл. «Прынцып

прыёму ў 1925 г.») [15, л. 4]. І хоць у 1926—1927 гг. сістэма камандзіровак у ВНУ для большасці арганізацый была скасаваная, прынцыпы класавага адбору студэнцтва засталіся без істотных змен [12, с. 82]. Да гэтай асаблівасці неабходна дадаць увядзенне платы за навучанне. Адпаведнае рашэнне было прынята Х Усерасійскім з'ездам Саветаў, які прайшоў у снежні 1922 г. Яно было афармлена дэкрэтам УЦВК і СНК у сакавіку 1923 г. Пры гэтым асноўны цяжар быў перанесены на больш забяспечаныя пласты насельніцтва. Нездарма ў інструкцыі, складзенай у 1924 г. ленінградскім губкамам РКП(б) для членаў губернскай стыпендыяльнай камісіі, адзначалася: «Платность — базис политического расслоения студенчества и завоевания ВУЗа и мера чистки ВУЗа от непролетарского элемента» [6, с. 138].

Істотна змянілася сістэма кіравання ВНУ. Лютаўская рэвалюцыя прынесла ВНУ доўгачаканую аўтаномію. На працягу функцыянавання мадэлі «свабоднага ўніверсітэта» назіралася барацьба паміж уладай і прафесурай, якія па-рознаму разумелі характар аўтаноміі. А вось з пераходам да «прагматычнай мадэлі» структура кіравання ВНУ змянілася. Яе адлюстраваннем стаў статут вышэйшай школы (афіцыйна — «Положение о Высших учебных заведениях РСФСР»). У канцы чэрвеня — пачатку ліпеня 1921 г. ён быў разгледжаны і ўхвалены на Усерасійскай канферэнцыі дзеячаў вышэйшай школы, а ў верасні зацверджаны СНК РСФСР [20, с. 255—256]. Згодна яму, усялякая аўтаномія ліквідавалася. Выканаўчым органам улады з'яўлялася Праўленне на чале з рэктарам, члены якога прызначаліся Наркаматам асветы. Напраўляючым і кантралюючым органам з'яўляўся Савет, куды ўваходзілі члены Праўлення, прадстаўнікі выкладчыкаў, студэнтаў (апошнія займалі трэцюю частку месцаў), прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. У ВНУ захоўвалася факультэцкая сістэма. На ўзроўні факультэта органамі ўлады з'яўляліся Савет і Прэзідыум. Першы фарміраваўся на тых жа прынцыпах, што і Савет ВНУ. Прадстаўнікі ж другога прызначаліся Праўленнем (за выключэннем аднаго чалавека, якога выбіралі студэнты) [20, с. 258—259].

У «Палажэнні» нічога не гаварылася пра кафедры і іх кампетэнцыю. Замест іх былі створаны прадметныя камісіі з усіх навуковых работнікаў і прадстаўнікоў студэнтаў. На думку даследчыкаў, камісіі павінны былі стаць «асноўнай арганізацыйнай ячэйкай, якая займаецца навучальна-навуковай і метадычнай працай у вышэйшай школе» [20, с. 259]. Толькі ў 1925 г. пасля змен у «Палажэнні» прадметныя камісіі былі вызвалены ад адміністрацыйных функцый [2].

Пасля хвалі забастовак у ВНУ, якія прайшлі ў Петраградзе, Маскве і Казані, кіраўніцтва бальшавікоў было вымушана крыху адступіць. У ліпені 1922 г. у «Палажэнне» былі ўнесены змены. Цяпер рэктар прызначаўся Наркаматам асветы з кандыдатаў, якіх вылучала прафесура [20, с. 232—233]. Але ў рэальнасці саступкі з боку ўлады былі не істотныя, бо насуперак рэкамендацыям прафесуры новыя формы арганізацыі, у тым ліку прадметныя камісіі, не былі адменены, а былым калегіяльным вузаўскім і факультэцкім саветам не вярнулі іх былыя паўнамоцтвы [5, с. 112—113].

Неабходна заўважыць, што на першапачатковым этапе функцыянавання мадэлі студэнцтва адыгрывала істотную ролю ў кіраванні ВНУ. Напрыклад, пасля правак, унесеных у «Палажэнне» ў 1922 г., студэнцкія арганізацыі атрымалі права кантролю за рацыянальным выкарыстаннем грашовых сродкаў і матэрыяльных рэсурсаў ВНУ [3, с. 131]. Пасля таго як высветлілася, што ўніверсітэты знаходзяцца пад поўным кантролем улады, патрэба ў студэнтах як альтэрнатыўнай сіле знікла. У выніку Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва пастанавіла ў ліпені 1924 г.: «Прызнаць неабходным удзел студэнцтва, і ў прыватнасці партыйнага, у будаўніцтве ВНУ; лічыць, што гэты ўдзел ні ў якім выпадку не павінен насіць характару адміністравання». Як адзначаецца, у кастрычніку таго ж года СНК і народны камісарыят асветы «вырашылі пакласці канец камандаванню студэнцкіх арганізацый у органах кіравання вышэйшай школы <...>. У партыйных і савецкіх дырэктывах неаднаразова падкрэслівалася, што праўленне з'яўляецца адзіным паўнамоцным органам, які нясе ўсю адказнасць за становішча і дзейнасць вышэйшай школы» [12, с. 76].

Сярод істотных змен у арганізацыі дзейнасці ВНУ было стварэнне новых навучальных планаў, у якіх быў зроблены акцэнт на скарачэнне агульнатэарэтычнай падрыхтоўкі, павелічэнне практычнай падрыхтоўкі праз семінары, ранні пачатак працоўнай практыкі (у 1923 г. дэкрэтам СНК была ўведзена студэнцкая вытворчая практыка, з 1924 г. — працяглыя летнія практыкі) і спецыялізацыі, скарачэнні тэрмінаў навучання да трох гадоў [9, с. 51, 74].

У пратаколе пасяджэння прэзідыума калегіі «Главпрофобра» РСФСР (5 снежня 1922 г.) былі зафіксаваны наступныя палажэнні: «При выработке новых типовых учебных планов положить в основу, путём соглашения с Наркоматами и Главками, те конкретные условия хозяйственного и общественного порядка и которые давно уже самостоятельно требуют как изменения качественной стороны выпускаемых ВУЗами

высококвалифицированных работников, так и системы учебно-учёной работы самих ВУЗов» [14, л. 20].

Яшчэ адной відавочнай новай рысай праводзіўшыхся змен стала ігнараванне навукова-вучэбнай функцыі ВНУ. У тлумачальнай запісцы да навучальных планаў фізіка-матэматычных факультэтаў, зацверджаных у 1923 г., Галоўны вучоны савет адзначаў, што «арганізацыя выкладання на кожным аддзяленні павінна мець на ўвазе падрыхтоўку практычных дзеячаў». Задача падрыхтоўкі навукоўцаў «ні ў якім разе не павінна вызначаць пабудову агульнаадукацыйнага навучальнага плану» [5, с. 392]. Дастаткова тыповымі для эпохі з'яўляліся наступныя погляды: «...для тых, хто выяўляе схільнасць да навуковай дзейнасці, хто можа пайсці па шляху вышэйшай кваліфікацыі, якую задавальняюць у сценах ВНУ, для тых створаны навукова-даследчыя кафедры самых разнастайных спецыяльнасцяў <...>; гэтым даследчым кафедрам, аднак, пастаўлена практычная мэта. Яны павінны даць прафесуру для вышэйшай школы, [яны] на чале з <...> Акадэміяй Навук, абавязаны задавальняць і запыты гаспадарчага, наогул, дзяржаўнага жыцця ў вобласці, што выходзіць за межы звычайнай кваліфікацыі школ» [7, с. 6].

У выніку ў РСФСР адбывалася згортванне фундаментальнай адукацыі. Напрыклад, фізіка-матэматычныя факультэты засталіся толькі ў Казанскім, Ленінградскім, Маскоўскім і Томскім універсітэтах. Але нават яны мелі практычны ўхіл [11, с. 254]. Наступствам такой палітыкі стала парушэнне адзінства навукова-вучэбнай функцыі ВНУ. Цяжар навуковых даследаванняў быў перанесены на Акадэмію навук і навукова-даследчыя інстытуты. Адкрыццё ў 1925 г. аспірантуры істотна не змяніла сітуацыю [20, с. 360].

У якасці яшчэ адной рысы адбываўшыхся змен можна вылучыць распаўсюджванне ў ВНУ марксісцка-ленінскай ідэалогіі, хаця яно яшчэ не мела татальнага характару. Адной з праяў даволі павярхоўнага авалодання марксізмам можна назваць прыклад, што нават у 1930 г. колькасць студэнтаў, што прымала ўдзел у грамадскай працы, была дастаткова нізкай. Так, у Ленінградзе ёю займаліся толькі 6 % студэнтаў, у Маскве — 9 % [8, с. 95].

Прыведзеныя вышэй прыклады кардынальных змен у арганізацыі кіравання і дзейнасці савецкіх ВНУ, як можна меркаваць, супярэчылі мадэлі «свабоднага ўніверсітэта», што панавала ў вышэйшай школе ў 1918 — пачатку 1920-х гг. Адначасова некаторыя з іх з'яўляліся для абедзвюх мадэляў агульнымі. Напрыклад, у 1920-я гг., як і раней, у большасці ВНУ РСФСР захоўвалася вольнае наведванне лекцый [9, с. 67]. Акрамя

таго, адсутнічалі жорсткія тэрміны, за якія неабходна было завяршыць навучанне. Так, у 1926/27 навучальным годзе ў ВНУ РСФСР налічвалася 34 % другагоднікаў. У тым жа годзе толькі 5,2 % выпускнікоў Маскоўскага вышэйшага тэхнічнага вучылішча закончылі ўстанову за неабходныя 5 гадоў (17,1 % вучыліся шэсць гадоў, 24,7 % — сем, 53 % — больш за сем) [9, с. 81].

Такім чынам, пры характарыстыцы «прагматычнай мадэлі», якая функцыянавала ў 1920-я гг. амаль на ўсёй тэрыторыі СССР (акрамя Украіны, дзе дзейнічала свая сістэма адукацыі), можна назваць наступныя яе прынцыпы: адзінства ў кіраванні вышэйшай школай і прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, нязначная колькасць ВНУ, класавы прынцып камплектавання студэнтаў, адміністрацыйны прынцып кіравання ВНУ, акцэнт на павелічэнне спецыялізацыі і прафесійнай падрыхтоўкі, ігнараванне навукова-вучэбнай функцыі ВНУ, павольнае распаўсюджванне марксісцка-ленінскай ідэалогіі. Рэалізацыя «прагматычнай мадэлі» ў СССР істотна адрознівалася ад першапачатковай тэарэтычнай задумы амерыканскіх філосафаў і набыла арыгінальныя, уласцівыя толькі ёй савецкія рысы.

У канцы 1920-х гг. у вышэйшай школе распачаліся карэнныя змены. Ва ўмовах правядзення курса індустрыялізацыі кіраўніцтва СССР адмовілася ад тэорыі «працоўнай школы» і пайшло на рашучую ломку вышэйшай адукацыі. У выніку адбыўся пераход да мадэлі, якая можа быць названай «прафесійнай» (у 1920-я гг. яна была рэалізаваная ва Украіне). Агульнымі рысамі новай мадэлі з папярэдняй сталі класавы прынцып камплектавання студэнтаў, адміністрацыйны прынцып кіравання ВНУ і ігнараванне яе навукова-вучэбнай функцыі.

Усе астатнія рысы супярэчылі «прагматычнай мадэлі». Была зменена сістэма падпарадкавання ВНУ (іх перадалі пад кантроль Вышэйшаму савету народнай гаспадаркі); рэзка павялічылася колькасць ВНУ (да 600 у 1933 г.) шляхам драбнення ўжо існуючых [18, с. 496]; ішло поўнае дамінаванне спецыялізацыі, якая набыла рамесніцкі характар; усталёўваўся поўны кантроль над студэнтамі шляхам абавязковага наведвання заняткаў і абавязковай грамадскай працы; у вышэйшай школе адбылася манапалізацыя марксісцка-ленінскай ідэалогіяй грамадскай і навуковай думкі. Сукупнасць гэтых фактараў дазваляе сцвярджаць, што ў канцы 1920-х гг. улада адмовілася ад «прагматычнай мадэлі» і ўзяла за аснову іншую канцэпцыю вышэйшай адукацыі, што, на іх думку, адпавядала патрэбам краіны.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Быть русским по духу и европейцем по образованию» = Russian in spirit and European by education / Германский исторический институт в Москве. М. : РОССПЭН, 2009. 335 с. (Россия и Европа. Век за веком).

2. Декрет СНК РСФСР от 03.07.1925 «Об изменении некоторых статей положения о высших учебных заведениях»// [Электронный ресурс]. Режим доступа : http://www.lawmix.ru/sssr/16698/ Дата доступа : 25.9.2012.

3. Из истории Московского университета. 1917—1941/ (под ред. Е. Н. Городецкого [и др.]. М. : Изд-во Моск. ун-та, 1955. 288 с.

4. Институты управления культурой в период становления, 1917—1930-е гг. Партийное руководство, государственные органы управления. М. : РОССПЭН, 2004. 310, (1) с.

5. *Квакин А. В., Постников Е. С.* Завоевание высшей школы: Профессорско-преподавательский состав и студенчество России в послереволюционное время (1917 — конец 1930-х годов). М. : Изд. дом «Ветераны спецслужб», 2009. 528 с.

6. *Купайгородская А. П.* Высшая школа Ленинграда в первые годы Советской власти (1917—1925 гг.). Л. : Наука. Ленинградское отделение, 1984. 197 с.

7. Народное просвещение на Украине / Народный комиссариат просвещения УССР. Харьков : Червоний шлях, 1924. 213 с.

8. *Овсянников К. М.* Классовая борьба в высшей школе и задачи комсомола. М. : Молодая гвардия, 1931. 175 с.

9. *Платова Е. Э.* Жизнь студенчества России в преходную эпоху 1917—1927 гг. СПб. : СПбГУАП, СпбГУ, 2001. 229 с.

10. *Подкина Н. А.* Прагматические педагогические идеи Джона Дьюи и их использование в современной школе : автореф. дис. ... канд. пед. наук. Чебоксары, 2003. 20 с.

11. *Поляков Н. В.*, *Савчук В.* С. Классический университет. Днепропетровск : Изд-во Днепропетровского ун-та, 2007. 596 с.

12. *Постников Е. С.* Российское студенчество в условиях новой экономической политики (1921—1927). Тверь : ТГУ, 1996. 188 с.

13. РГАСПИ. Ф. 17. Оп. 60. Ед. хр. 250. Тезисы к докладу Главпрофобра (7 октября 1922 г.).

14. РГАСПИ. Ф. 17. Оп. 60. Ед. хр. 267. Протокол заседания президиума коллегии Главпрофобра (5 декабря 1922 г.).

15. РГАСПИ. Ф. 17. Оп. 60. Ед. хр. 607. Инструкция «О введении платности в высших учебных заведениях народного комиссариата по просвещению» (22 мая 1923 г.).

16. *Рогачёва Е. Ю.* Педагогика Джона Дьюи в XX веке: кросс-культурный контекст. Владимир : ВГПУ, 2005. 333 с.

17. *Ряппо Я. П.* Реформа высшей школы на Украине в годы революции (1920—1924). Харьков : Госиздат Украины, 1925. 153 с.

18. *Сталин И. В.* Вопросы ленинизма: 11-е изд. М. : Госполитиздат, 1952. 651 с.

19. *Томина Е. Ф.* Дж. Дьюи — выдающийся педагог XX столетия. Оренбург : ИПК ГОУ ОГУ, 2009. 128 с.

20. *Чанбарисов Ш. Х.* Формирование советской университетской системы. М. : Высш. шк., 1988. 255, (1) с.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 25 верасня 2012 г.